Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія кадры

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 21 (207)
Нядзеля
7
лістапада
1954 г.

Цана 20 кап.

Юнакі і дзяўчаты, наша слаўная совецкая моладзь! Настойліва вывучайце дасягненні перадавой навукі і тэхнікі, авалодвайце ведамі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці! Будзьце стойкімі і смелымі ў барацьбе за перамогу вялікай справы комунізма ў нашай краіне!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 37-ай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі)

СЛАЎНЫ КАСТРЫЧНІК

37 год назад залпы «Аўроры» абвясцілі аб пачатку новай эры ў жыцці чалавецтва—эры крушэння капіталізма і перамогі комунізма. На адной шостай частцы зямнога шара яркім полымем успыхнулі агні свабоды і шчасця для простага чалавека, які ўпершыню расправіў сагнутыя прыгнётам і непасільнай працай плечы і з упэўненасцю пакрочыў у будучае.

37 год—невялікі адрэзак часу, але ён быў дастатковым для таго, каб створаная ў выніку Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі соцыялістычная сістэма поўнасцю даказала свае перавагі перад гніючай капіталістычнай.

Першая ў свеце дзяржава рабочых і сялян у жорсткай барацьбе з 14 імперыялістычнымі драпежнікамі даказала сваё права на існаванне. Яна перамагла ўсе цяжкасці ўзнаўленчага перыяду і ператварылася ў магутную індустрыяльна-калгасную дзяржаву. У дні Вялікай Айчыннай вайны яна выратавала свет ад чорнай фашысцкай навалы.

І ў дні вайны, і ў дні мірнай стваральнай працы народы совецкай краіны даказалі на справе, што яны могуць жыць без капіталістаў і памешчыкаў, што яны самі могуць кіраваць сваёй дзяржавай, палітыкай якой з'яўляецца палітыка міру і росквіту народаў. Таму СССР стаў магутным маяком, які асвятляе працоўным усяго свету шлях да свабоды і шчасця. Таму СССР узначаліў непераможны лагер міру, дэмакратыі і соцыялізма.

Мы ганарымся тым, што з'яўляемся грамадзянамі вялікага Совецкага Саюза, шчаслівы тым, што наша навучальная ўстанова носіць імя яго правадыра і заснавальніка вялікага Леніна. Разам з усім совецкім народам мы ўпэўнена ідзем да вабячых вяршынь цудоўнага будучага чалавецтва—да комунізма.

Расце і мацнее наша Радзіма, а разам з ёй расце і добрабыт працоўных. З кожным днём прыгажэе наш родны горад, расце і пашыраецца наш універсітэт. Гэта ўсё—вялікія клопаты роднай Комуністычнай партыі аб чалавеку працы. І ў гэтае ўрачыстае імгненне, крочачы ў святочных калонах па вуліцах прыгожага Мінска, мы клянёмся, што аддадзім усе свае сілы, веды, пачуцці і імкненні роднай краіне. Мы будзем стойкімі і мужнымі ў барацьбе за перамогу вялікай справы комунізма.

Раўняцца на перадавых!

У першых радах святочных калон мы ўбачым сёння нашых лепшых таварышаў: Галіну Барташэвіч, Рыму Маленчанка, Аляксандра Хоміча, Владзілена Калера, Івана Зяцькова, Уладзіміра Бузака... Ды ці пералічыш усіх 368 універсітэцкіх выдатнікаў, якія радуюць Радзіму добрымі адзнакамі і актыўнай грамадскай работай!

Крыху сумна сёння Владзілену Калеру: гэта яго апошні Кастрычнік ва універсітэце. Праз восем месяцаў ён закончыць хімічны факультэт. А пасля—самаадданая праца ў сярэдняй школе ці лабараторыі завода. І калі Владзілен думае аб гэтым будучым, грудзі яго поўняцца шчасцем і спадзяваннем. Ён мае права на гэтае шчасце! За яго ён змагаўся на франтах Айчыннай вайны. Аб ім ён думаў у незабыўны дзень 7 лістапада 1943 года, калі ўпершыню стаў камандаваць агнём зенітнай батарэі, якая тады збіла тры варожыя самалёты і не дазволіла фашыстам бамбардыраваць Смаленск. Дзеля гэтага шчасця пасля адзінаццацігадовага перапынку ў вучобе паступіў ён ва універсітэт. Многа папрацаваў Владзілен напярэдадні Кастрычніцкіх свят. Ён правёў першыя доследы для дыпломнай работы, якая захапіла будучага хіміка. Апрача таго Калеру, як адказнаму за насценны друк ад партгрупы хімфака, трэба было дапамагчы рэдактарам у выпуску цікавых святочных нумароў. Зроблена нямала. І таму так лёгка на сэрцы ў Владзілена.

У напружанай працы прайшлі перадсвяточныя дні і ў студэнта трэцяга курса аддзялення геаграфіі Аляксандра Хоміча. Нядаўна яго выбралі сакратаром комсамольскага бюро геафака. Аляксандр імкнецца ажывіць дзейнасць груп, перанесці туды цэнтр работы.

Сёння ў калоне універсітэта мы ўбачым нашых новых таварышаў з юрыдычнага факультэта. Сярод іх—член КПСС, студэнт 4-га курса Уладзімір Бузак. Ён спалучае выдатную вучобу з паўсядзённай грамадскай работай. Для яго—гэта першы універсітэцкі Кастрычнік!

З чыстым сумленнем выйдуць на святочную дэманстрацыю выдатніцы аддзялення рускай мовы і літаратуры Галіна Барташэвіч і Рыма Маленчанка. Ні адна хвіліна не прападае для іх дарма. Ды і як-жа інакш? Рыма, як староста групы, павінна паказваць іншым ва ўсім прыклад. А Галіна адказвае за вучэбны сектар ад камітэта комсамола. Яна разумее, што павінна не толькі сама выдатна вучыцца, але і дапамагаць іншым. Многа прышлося ёй папрацаваць, каб арганізаваць да свята дошку гонару. 56 выдатнікаў—лепшыя з лепшых—былі занесены туды.

Прайшоў усяго год. Але колькі новага, захапляючага адбылося ў студэнцкім жыцці, як за гэты час выраслі нашы таварышы: сакратаром партыйнага бюро фізмата абралі комуністы студэнта 3-га курса аддзялення фізікі, былога воіна Івана Зяцькова, Сталінскую стыпендыю атрымала Галіна Барташэвіч. А колькі паспела зрабіць за гэты год Рыма Маленчанка! Яна здала на выдатна дзве экзаменацыйныя сесіі, атрымала другі разрад па гімнастыцы, паспяхова выканала ролю Дзіяны Міхайлаўны ў камедыі Мінко «Не называючы прозвішчаў». У перадсвяточныя дні яна працавала над стварэннем вобраза Ані ў п'есе Чэхава «Вішнёвы сад».

Прышло доўгачаканае свята. Весела правядуць яго нашы студэнты. Пасля дэманстрацыі Аляксандр Хоміч паедзе ў Вільнюс, каб сустрэцца з роднымі і таварышамі. Рыма запрошана на студэнцкае вяселле да сваёй аднакурсніцы Валянціны Антончык. А Владзілен Калер, хутчэй за ўсё, сустрэне свята ў кругу сваёй сям'і, разам з маленькім сынам Герай... Той, хто заўсёды ідзе наперадзе, хто паказвае іншым прыклад у вучобе і працы, можа сёння весяліцца ад усяго сэрца!

А. МАЛЬДЗІС.



А. Хоміч

Р. Маленчанка



В. Бузак

В. Калер

І. Зяцькоў

Г. Барташэвіч

Сустрэча са сведкамі рэволюцыйных дзён

Напярэдадні 37-ай гадавіны вялікага Кастрычніка студэнты II курса аддзялення геаграфіі запрасілі на свой комсамольскі сход сведкаў незабыўных дзён рэволюцыі П. І. Хрыпко і Г. С. Окулава.

З вялікай увагай і цікавасцю слухалі студэнты ўспаміны гасцей аб слаўных кастрычніцкіх падзеях.

ПАРТЫЙНУЮ РАБОТУ НА НОВЫ, ВЫШЭЙШЫ ЎЗРОВЕНЬ!

★

Больш увагі выхаваўчай рабоце

(З выступлення т. НАХІМОЎСКАЙ)

Выхаваўчая работа сярод студэнтаў праводзіцца ўсё яшчэ дрэнна. Многія навуковыя работнікі не прымаюць у ёй ніякага ўдзелу. Калі ў мінулым навучальным годзе ў нас праводзіліся палітінфармацыі, то ў гэтым годзе яшчэ і іх няма.

Партыйнае бюро прыняло рашэнне замяніць палітінфармацыі іншымі формамі выхаваўчай работы, але гэтыя новыя формы пакуль што застаюцца толькі словамі. Ствараемыя на факультэтах лекцыйныя бюро яшчэ ніякай работы не праводзяць.

Неарганізавана пачалася ў гэтым годзе вучоба ў сетцы партыйнай асветы. На першыя лекцыі ў асобных гуртках не з'явіліся многія слухачы, таму што не ведалі нават, куды іх залічылі.

Лепш кіраваць комсамолам

(З выступлення А. РАКАВА)

Кіраўніцтву комсамолам партыйнае бюро ў мінулым навучальным годзе ўдзяляла мала ўвагі. Уся работа зводзілася да таго, што на бюро разглядаліся планы работ камітэта комсамола. Але як гэтыя планы праводзіліся ў жыццё, партыйнае бюро ведала дрэнна, бо члены бюро не бывалі на пасяджэннях камітэта, а таксама на комсамольскіх сходах.

Праўда, партбюро некалькі разоў заслухоўвала справаздачы комсамольскіх бюро факультэтаў, але ад гэтага было мала карысці, таму што партыйнае бюро не старалася высветліць прычыны недахопаў, а больш за ўсё абмяжоўвалася крытыкай комсамольскіх кіраўнікоў за дрэнную работу.

Палепшыць работу шматтыражнай газеты

(З выступлення В. СІКОРСКАГА)

Партыйная арганізацыя і партыйнае бюро прарабілі значную работу, але разам з тым у нас маецца шмат недахопаў. Я застанаўлюся на рабоце газеты «За сталінскія кадры». Я праглядзеў матэрыялы газеты за 6 месяцаў, але не знайшоў амаль ніводнага сур'ёзнага матэрыялу на навуковую тэму. Як правіла, у газеце змяшчаюцца справаздачы, а таксама слабыя заметкі аб рабоце кафедраў. Так, напрыклад, у нумары ад 18 кастрычніка перадавы артыкул «За вучобу, сябры»—слабы. У ім толькі адны громкія фразы, заклікаючыя з першых дзён прыняцца за вучобу. У газеце ёсць артыкул тав. Ігнаценкі, але, на жаль, гэты артыкул не паказвае на канкрэтных прыкладах, як лепш праводзіць сходы: указваецца аб разгортванні крытыкі і самакрытыкі—і больш нічога. Ёсць там артыкул тав. Захаравай, які з'яўляецца зборам фактаў. Маецца таксама і падборка «На універсітэту», але яна, трэба сказаць, слабаватая: Партбюро універсітэта, а таксама кафедра тэорыі і практыкі совецкага друку не надаюць патрэбнай увагі друку. Склад рэдкалегіі не ўкамплектован. Мне здаецца, што неабходна пераняць вопыт Маскоўскага, Саратаўскага, Свердлоўскага і іншых універсітэтаў і падабраць у склад рэдкалегіі навуковых работнікаў.

★★★

Са справаздачна-выбарчага партыйнага сходу

28 кастрычніка адбыўся справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі універсітэта. З дакладам аб рабоце партбюро выступіў сакратар бюро І. М. Ігнаценка. У разгарнуўшыхся спрэчках выступіла 16 камуністаў, якія ўскрылі істотныя недахопы ў рабоце бюро і ўнеслі рад каштоўных прапаноў. Сход прызнаў работу бюро здавальняючай і прыняў рашэнне, якое накіравана на далейшае палепшанне партыйнай работы. Абраны новы склад бюро ў колькасці 11 чалавек і дэлегаты на раённую партыйную канферэнцыю.

З дакладу І. М. ІГНАЦЕНКІ

Галоўнай задачай партыйнага бюро і ўсёй партыйнай арганізацыі універсітэта за справаздачны перыяд было забеспячэнне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі і культуры краіны.

Выконваючы патрабаванні Партыі і Совецкага Урада ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў, партарганізацыя, рэктарат, кафедры штодзённа накіроўвалі ўвагу на сістэматычнае паляпшэнне вучэбнага працэсу.

Кафедры перагледзелі праграмы і планы лекцыйных і практычных заняткаў у напрамку набліжэння іх да патрэб вытворчасці. У праграму па аналітычнай хіміі ўключаны такія пытанні, як аналіз глебаў, угнаенняў, прэпаратаў, якія ўжываюцца для барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспаркі. На III і IV курсах біёлага-глебавага факультэта ўведзены спецкурсы, непасрэдна звязаныя з сельскай гаспадаркай. Перагледжана тэматыка курсавых, дыпломных работ і дысертацый, абмеркаваны многія навуковыя працы і дапаможнікі.

На кафедрах праводзілася ўзаемнаведванне лекцый, сценаграфаванне і абмеркаванне гэтых лекцый. Кантроль за якасцю лекцый асабліва добра быў арганізаваны кафедрамі дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма, беларускай мовы і літаратуры, геалогіі і заалогіі. Партбюро абмеркавала работу кафедраў тэорыі і практыкі совецкага друку, эканамічнай геаграфіі, рускай літаратуры і прыняло рашэнне, накіраванае на ліквідаванне недахопаў у дзейнасці гэтых кафедраў.

У мэтах умацавання кафедраў кваліфікаванымі выкладчыкамі вясной было прынята рашэнне аб правядзенні конкурса, які аднак не даў жаданых вынікаў. На двух кафедрах фізіка-матэматычнага факультэта конкурс зусім не адбыўся. Не прайшоў конкурс і на кафедры рускай літаратуры.

Назіраюцца факты парушэння працоўнай дысцыпліны як з боку студэнтаў, так і з боку выкладчыкаў. Неаднаразова зрываў заняткі без уважлівых прычын член КПСС тав. Талкачоў. У гэтым годзе чытанне курса лекцый па совецкай літаратуры на аддзяленні журналістыкі сарваў комуніст тав. Сторажаў. За парушэнне працоўнай дысцыпліны тт. Талкачоў і Сторажаў атрымалі партыйнае спагнанне, а рэктарат зволіў іх з работы. Вялася жорсткая барацьба з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны і амаральнымі ўчынкамі сярод студэнтаў. Сем студэнтаў былі выключаны з універсітэта, комуністу Кажамякіну партыйны сход вынес вымову.

У гэтым годзе бачна паляпшэнне навуковай работы. На партыйных сходах і пасяджэннях партыйнага бюро абмяркоўваліся пытанні пастаноўкі навукова-даследчай работы на кафедрах, факультэтах і ва ўніверсітэце, а таксама пытанні аб СНТ і аспірантах усіх гадоў навучання.

У гэтым годзе закончылі докторскія дысертацыі тт. Шашкоў, Фёдараў, Фішэр, заканчваюць—Ларчанка, Сцяпанаў. Сур'ёзна працуюць над доктарскімі і кандыдацкімі дысертацыямі тт. Шмыгаў, Нячай, Азарэнка, Тамашэвіч, Шнеерсон, Рагоўскі і другія. Датэрмінова абараніў кандыдацкую дысертацыю комуніст І. Науменка, у тэрмін—Міронаў.

Надзвычай марудна, або зусім не працуюць над доктарскімі дысертацыямі тт. Баркан, Раманоўскі, Шкляр, Нахімоўская, Панкратаў, Калішэвіч, Бірала, Зярніцкі і другія.

Сур'ёзным недахопам навукова-даследчых прац нашых вучоных з'яўляецца тое, што ў іх рэдка вырашаюцца праблемы, якія-б мелі вялікае навуковае і народнагаспадарчае значэнне.

У рабоце СНТ удзельнічала каля 1000 студэнтаў. Да кіраўніцтва імі былі прыцягнуты лепшыя прафесарска-выкладчыцкія сілы. Асабліва добра працавалі гурткі, якімі кіравалі тт. Вінберг, Жыркевіч, Сцяпанаў, Паўлючэнка, Пратасеня.

У сістэме партыйнай асветы універсітэта ў мінулым годзе працавалі філасофскія семінары, семінары па праблемах палітэканоміі, па вывучэнню твораў класікаў марксізма-ленінізма, гурткі па вывучэнню гісторыі КПСС і палітшколы. Усяго ў сетцы партыйнай асветы займалася 209 чалавек. Аднак і тут быў шэраг недахопаў: не заўсёды захоўваўся прынцып добраахвотнасці ў выбары форм вучобы, у работу гурткоў уцягваліся людзі старога ўзросту, жанчыны з малымі дзецьмі. Профсаюзная арганізацыя самаўхілялася ад работы на наладжванню вучобы беспартыйнага выкладчыцкага складу.

У бягучым годзе партыйнае бюро строга захоўвае прынцып добраахвотнасці ў выбары форм палітвучобы, прымае меры да ліквідавання іншых недахопаў. Большасць комуністаў выказала жаданне вывучаць марксісцка-ленінскую тэорыю самастойна, што не зніжае, а, наадварот, павышае адказнасць партыйнай арганізацыі па кіраўніцтву партасветай. Засталося працягваць работу ўсяго некалькі гуркоў. Створаны лектарскія групы, якія закліканы дапамагчы комуністам у самастойнай вучобе. Самастойную работу трэба кантраляваць і сачыць за тым, каб яна не ператварылася ў шырму для прыкрыцця бяздзейнасці.

Палітінфармацыі, якія праводзіліся ў мінулым годзе са студэнтамі, праходзілі суха, нецікава і не апраўдалі сябе, хоць для правядзення іх накіроўваліся лепшыя выкладчыцкія сілы. Таму партбюро прапанавала замест інфармацый правадзіць на факультэтах лекцыі на актуальныя тэмы.

Значную ўвагу партыйнае бюро ўдзяляла і культурна-масавай рабоце. Аднак у другім семестры старшыня праўлення клуба тав. Лапцёнак пагоршыў кіраўніцтва работай клуба. Многа недахопаў ў рэпертуары калектываў мастацкай самадзейнасці. Напрыклад, у рэпертуар рэдка ўключаліся творы беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў, слаба вялася работа па ўцягненню новых удзельнікаў у самадзейныя калектывы, мала дэманстравалася навукова-папулярных і дакументальных фільмаў, абмеркаванне прагледжаных спектакляў вялося слаба, не чыталіся лекцыі па эстэтыцы для ўдзельнікаў самадзейнасці. Нездавальняюча кіравалі мастацкай самадзейнасцю на факультэтах камітэт комсамола і прафком.

Слаба праводзілася палітыка-выхаваўчая работа ў інтэрнатах. Мала культурна-масавых мерапрыемстваў праводзіў мясцком няглезячы на вялікі план.

Партбюро дамагалася таго, каб газеты аказвалі дзейсную дапамогу рэктарату, партыйнай і іншым грамадскім арганізацыям у вырашэнні задач, якія стаяць перад універсітэтам. Лепш другіх была пастаўлена работа насценных газет аддзялення журналістыкі «За перадавую навуку» і філалагічнага факультэта «Слова філолага». Да ліку лепшых можна аднесці і газету фізмата. Горш працавалі рэдкалегіі на геолага-геаграфічным і біёлага-глебавым факультэтах. Многа займалася партбюро работай шматтыражнай газеты «За сталінскія кадры». Аднак яна яшчэ не зрабілася дзейсным памочнікам партбюро і рэктарата. У газеце друкуюцца сырыя вершы, нарысы, фельетоны, дапускаюцца граматычныя памылкі.

Нягледзячы на вялікую работу, якую прарабіла партбюро з дапамогай камітэта ЛКСМБ і прафкома па культурнаму выхаванню студэнтаў, яна ўсё яшчэ знаходзіцца на нізкім узроўні.

Уноў абранаму партыйнаму бюро трэба яшчэ больш узмацніць работу па палітычнаму выхаванню студэнтаў. Зараз перад партыйнай арганізацыяй універсітэта стаяць вялікія задачы.

★

УЗНЯЦЬ ВУЧЭБНУЮ І НАВУКОВУЮ РАБОТУ

(З выступлення К. І. ЛУКАШОВА)

Перш за ўсё мне хочацца адзначыць той факт, што ў склад нашага універсітэта ўлілося 950 студэнтаў і звыш 50 выкладчыкаў юрыдычнага факультэта.

У нас зараз 3500 студэнтаў на стацыянары і 2500 на завочным аддзяленні. У той-жа час мы маем усяго 23 прафесары, гэта значыць, што мы не разлічваем яшчэ такім лікам вопытных, высокакваліфікаваных выкладчыкаў, якія-б змаглі задаволіць нашы патрэбы. Галоўным чынам, ад гэтага церпіць навуковая работа. Таму галоўнай нашай задачай з'яўляецца ўмацаванне кадраў. За мінулыя два гады ўсяго 6 чалавек было накіравана ў дактарантуру, а праз 2—3 гады нам трэба мець каля 50 дактароў і прафесараў навук.

У вучэбна-выхаваўчай рабоце ў нас яшчэ многа недахопаў. Многія выкладчыкі ўсё яшчэ вядуць лекцыі на сярэднім узроўні. Хочацца, каб гэты «сярэдні ўзровень» падымаўся да больш высокага. Асноўнай крыніцай дапамогі павінны з'явіцца кафедры факультэтаў. У нас усе кафедры вялікія і склад іх добры, але некаторыя з іх працуюць яшчэ слабавата. 21-шы з'езд Комуністычнай партыі Беларусі адзначыў, што ва універсітэце не распрацоўваюцца сур'ёзныя тэмы, якія-б мелі народнагаспадарчае значэнне.

Вялікім недахопам навукова-даследчай работы з'яўляецца таксама тое, што ў нас яшчэ не выдана ніводнага падручніка і вучэбнага дапаможніка. Да таго часу, пакуль нашыя кафедры не выдадуць добрых падручнікаў, будуць гаварыць пра наш калектыў, як пра слабы і недастаткова працуючы.

Сур'ёзней займацца мастацкай самадзейнасцю

(З выступлення Г. Герасімена)

У нас вельмі мала ўвагі ўдзяляецца развіццю мастацкай самадзейнасці. Дакладчык адзначыў, што ва універсітэце ў сучасны момант працуе 20 гурткоў мастацкай самадзейнасці. Па-мойму, правільней быбо-б сказаць «працавала». Асабліва на факультэтах гэтая работа зараз зусім замёрла, а комсамольская і профсаюзная арганізацыі не надаюць ёй патрэбнай увагі. Дэкламатараў не рыхтуюць. Звычайна на вечарах пасля даклада пачынаюцца танцы. Чаму? Таму, што няма новых нумароў у існуючых калектываў самадзейнасці, а са старым рэпертуарам няёмка выступаць у каторы раз перад студэнтамі.

Скора пачнецца агляд мастацкай самадзейнасці горада. З чым мы выступім? Над гэтым пытаннем патрэбна сур'ёзна задумацца грамадскім арганізацыям універсітэта і асабліва комсамольскаму і профсаюзнаму кіраўніцтву факультэтаў.

НОВЫ СКЛАД ПАРТБЮРО

Сакратаром партбюро абраны т. **І. М. Ігнаценка,** намеснікам па палітыка-выхаваўчай рабоце—**І. Н. Лушчыцкі,** намеснікам па арганізацыйна-масавай рабоце—**М. В. Прылепка.**

У склад бюро ўвайшлі **Т. А. Базылеў, А. А. Волк, К. І. Лукашоў, А. Я. Малышэў, Г. А. Павецьеў, А. Ф. Патрын, П. Ф. Пратасеня, Н. Е. Рагозін.**

МАЛАДЫ ВУЧОНЫ



Чатыры гады назад Іван Якаўлевіч Науменка завочна закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя В. І. Леніна і паступіў у аспірантуру па кафедры беларускай мовы і літаратуры. А да гэтага ён працаваў пяць год карэспандэнтам абласной газеты „Савецкае Палессе“ і рэспубліканскай газеты „Звязда“.

Ён часта бываў у калгасах, добра вывучыў жыццё сельскіх працаўнікоў. Работа ў газеце дапамагла яму потым выбраць тэму дысертацыі — „Праца ў творчасці Я. Коласа.“

...Успамінаюцца дні, калі пасля работы ў рэдакцыі даводзілася пераглядаць дзесяткі кніг, узнаўляючы ў памяці забытае ці выпадкова ўпушчанае. У чэрвені 1954 года адбылася абарона дысертацыі, і Іван Якаўлевіч атрымаў ступень кандыдата філалагічных навук. З пачатку новага навучальнага года яму ўжо даручылі вясці семінарскія заняткі і чытаць курс лекцый па гісторыі беларускай літаратуры.

Цяпер малады выкладчык настойліва працуе над сабой, папаўняючы і замацоўваючы свае веды.

А. НЭЛІНА.

У перадсвяточныя дні

Да XXXVII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі студэнты аддзялення журналістыкі нашага універсітэта падрыхтавалі ў падарунак студэнтам факультэта журналістыкі Варшаўскага універсітэта тры альбомы адкрытак: «Рускае выяўленчае мастацтва», «Віды гарадоў Савецкага Саюза» і «Выяўленчая творчасць совецкага мастака Герасімава».

Варшаўскія сябры пазнаёмяцца з відамі Масквы, Ленінграда, Кіева, Мінска, з рэпрадукцыямі карцін Рэпіна, Сурыкава, Левітана і другіх рускіх мастакоў.

* * *

Нядаўна ва універсітэце адбыўся вечар першакурснікаў. Вечар адкрыў загадчык кафедрай фізкультуры і спорту Е. Маркаў. Ён уручыў граматы і дыпломы пераможцам асенняга кроса і розыгрыша першынства першых курсаў па валейболу і баскетболу. Потым перад удзельнікамі вечара выступіў заслужаны майстар спорту чэмпіён СССР і Еўропы па кіданню молата Міхаіл Крываносаў. Ён расказаў аб дасягненнях совецкіх спартсменаў, аб апошніх міжнародных сустрэчах.

Вечар закончыўся выступленнямі спартсменаў-разраднікаў: гімнастаў. штангістаў, баксёраў.

* * *

З кожным годам мацнеюць сувязі паміж студэнтамі нашага універсітэта і Беларускага політэхнічнага інстытута імя І. В. Сталіна. Студэнцкія калектывы абменьваюцца вопытам у навукова-даследчай рабоце, у дзейнасці комсамольскіх актывістаў, наладжваюць абменныя выступленні мастацкай самадзейнасці.

Цяпер студэнты універсітэта рыхтуюць для сваіх сяброў радыёперадачу, прысвечаную жыццю і справам універсітэта. Студэнты політэхнічнага інстытута пазнаёмяцца з гісторыяй Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна, з традыцыямі яго выхаванцаў, даведаюцца аб буднях старэйшай навучальнай установы рэспублікі.

* * *

У спартыўнай зале універсітэта адбыліся спаборніцтвы студэнтаў-першакурснікаў па валейболу. У спаборніцтвах удзельнічалі мужчынскія і жаночыя каманды факультэтаў. Першымі сустрэліся жаночыя каманды філалагічнага і хімічнага факультэтаў. Ва ўпартай барацьбе перамаглі філолагі. У фінале яны сустрэліся з камандай геолага-геаграфічнага факультэта, якая перад гэтым выйграла сустрэчу ў каманды фізіка-матэматычнага факультэта. Пераможцамі аказаліся спартсмены геолага-геаграфічнага факультэта.

Сярод мужчынскіх каманд у фінал выйшлі каманды аддзялення журналістыкі і геолага-геаграфічнага факультэта. Апошняя каманда атрымала перамогу і заваявала першае месца.

* * *

У клубе нашага універсітэта адбыўся вечар, прысвечаны пяцігоддзю з дня гібелі выдатнага украінскага пісьменніка-змагара, пал кага публіцыста Яраслава Галана.

Даклад аб жыцці, творчасці і барацьбе Яраслава Галана зрабіў студэнт V курса аддзялення журналістыкі П. Ткачоў.

НА РЭПЕТЫЦЫІ ДРАМКАЛЕКТЫВУ



Калі на сцэну паднімаецца Кузьма Львовіч Рутштэйн, шум змаўкае. Члены тэатральнага калектыву ўважліва слухаюць свайго кіраўніка.

— Сёння мы працягваем мізансцэніраванне першага акта,—гаворыць ён.—Паўторым пачатак акта.

Імгненне сцэна пустая. Потым выходзіць Муза Заслонава, якая рэпетыруе ролю Дуняшы. У яе руках абломак стула, які замяняе патрэбны па ходу дзеяння падсвечнік. Услед за ёю на сцэне з'яўляецца Аркадзі Рудой.

— Прышоў поезд, слава богу. Якая гадзіна?—старанна басіць ён, выконваючы ролю Лапахіна.

Кузьма Львовіч уважліва назірае за кожным рухам выканаўцаў. Ён часта перарывае рэпетыцыю, каб зрабіць заўвагу, як лепш сыграць тую ці іншую сцэну, растлумачвае сэнс незразумелай фразы. Зноў і зноў паўтараецца ўрывак, пакуль не загучыць ён па-сапраўднаму, пакуль вопытны рэжысёр не ўловіць таго, што ён называе «ансамблем спектакля», г. зн. узгодненых, лагічна апраўданых дзеянняў усіх выканаўцаў.

Тыя, што не заняты ў рэпетыцыі, выконваюць ролю гледачоў.

Яны ўжо некалькі разоў бачылі сцэну паяўлення Епіходава, але, нягледзячы на гэта, не могуць утрымацца ад смеху, назіраючы за тым, як гэты фізічна нязграбны чалавек, прэтэндуючы на адукаванасць, натыкаецца на стулы, гаворыць бязглуздзіцу і штохвілінна трапляе ў няёмкія становішчы. Сёння гэтую ролю выконвае Анатоль Лунін. Яму не ўдаецца сцэна выхаду, калі Епіходаў, зачапіўшыся за ступеньку, павінен расцягнуцца на падлозе. Сцэну прыходзіцца паўтарыць некалькі разоў. І Анатоль падае, пакуль рэжысёр не гаворыць задаволена:

— Пойдзем далей.

Так праходзіла адна з рэпетыцый пьесы А. П. Чэхава «Вішнёвы сад».

Шосты год існуе ва універсітэце тэатральны калектыў. За гэты час ён здзейсніў 8 пастановак па п'есах рускіх і беларускіх пісьменнікаў. «Вішнёвы сад»—дзевятая работа калектыву.

А. ДЫМАЎ.

НАШЫ БУДНІ



1

2



3

Цікавым і рознабаковым жыццём жывуць студэнты нашага універсітэта. Кожную раніцу заклікальна звіняць званкі, і тысячы юнакоў і дзяўчат запаўняюць аўдыторыі. А пасля заняткаў ажываюць спартыўныя пляцоўкі, распачынае сваю работу клуб, дзе праводзяцца рэпетыцыі драматычнага, харавога, харэаграфічнага, струннага і іншых калектываў мастацкай самадзейнасці

Сёння мы расказваем аб буднях універсітэцкай моладзі.

На першым здымку вы бачыце чытальную залу універсітэта, дзе самастойна працуюць сотні студэнтаў. Акрамя гэтай залы да паслуг студэнтаў добра абсталяваныя кабінеты, лабараторыі.

Вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў рэспублікі і вучняў сярэдніх школ карыстаецца універсітэцкі музей. Толькі за гэты год у музеі пабывала 178 экскурсій, у склад якіх уваходзіла да 6000 чалавек. Вы бачыце (другі здымак) загадчыка музеем Ф. Н. Вароніна, які знаёміць вучняў Новадворскай сярэдняй школы з экспанатамі музея.

А гэта (трэці здымак) аматар паслухаць радыё—студэнт аддзялення журналістыкі Г. Зотаў. Шмат вольнага часу ён праводзіць у ленкомнаце інтэрната па вуліцы Свердлова ля радыёпрыёмніка. Вечарамі ленкомната запаўняецца студэнтамі, якія жадаюць пачытаць новыя газеты, часопісы. Тут часта наладжваюцца цікавыя лекцыі, сустрэчы з дзеячамі мастацтва рэспублікі.

Нядаўна ва універсітэце адкрыўся новы, юрыдычны факультэт. Сярод студэнтаў-юрыстаў многа здольных спартсменаў, аматараў валейбола, баскетбола. Вы бачыце момант міжкурсавых спаборніцтваў па баскетболу на юрыдычным факультэце (здымак чацверты).

Наогул ва універсітэце любяць і паважаюць спорт. Самыя мужныя і смелыя ідуць у парашутны гурток, у якім ужо другі год інструктарам працуе студэнтка IV курса аддзялення журналістыкі Тамара Сарока. За гэты час яна падрыхтавала нямала парашутыстаў-спартсменаў. Сярод іх трэцеразраднікі студэнтка другога курса хімічнага факультэта Л. Казлоўская, работніца картаграфічнай фабрыкі З. Лакціонава і іншыя. На пятым здымку вы бачыце Т. Сароку, якая праводзіць заняткі са студэнткай II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Е. Сіляўка.

Яшчэ многае можна расказваць аб будзённых справах нашых студэнтаў, якім універсітэт дае не толькі вялікую навуковую, але і культурную і фізічную падрыхтоўку.



4

5

Алесь Чабор.

* * *

Ноч. Марозіць. Снег рыпіць,
Быццам цукар крохкі.
Ўдаль бягуць, гудуць слупы.
Свежа. Слаўна. Лёгка.

Абажур жывы нябёс
Зорамі затканы.
Па-над шляхам строй бяроз
Шэранем прыбраны.

Апрануты ў лёд-граніт
Шнур калгасных вуліц
Электрычнасцю заліт.
Светла так, утульна.

Клуб ажыўлен, як заўжды,
Людна тут, вясёла:
Цягне ўсіх прыйсці сюды—
І старых і моладзь.

Лье гармонь у ціш начы
Срэбра гукаў дзіўных.
Песня мкнецца ў далячынь
Звонка, пераліўна.

Песня птушкаю ляціць
Аж да зораў ясных.
Аб шчаслівым, аб жыцці,
Аб жыцці калгасным.

* * *

Чуйна спіць ваколле. Поўнач
Зямлю абняла.
Месяц лье з даёнкі поўнай
Малако святла.

Ветрык ліпеньскі даносіць
Сена-чаю пах.
Перашэпт буйных калоссяў
Чуецца ў жытах.

Разышлася моладзь з клуба.
Песні! Не да сну!
Вось хлапец з дзяўчынай любай
Ўздоўж ракі імкнуць...

Не змаўкаюць да заранак,
Будзяць ночы ціш.
Песні звонкія каханых
Аб вясне ў жыцці.

НА ВЁСЦЫ КАЛГАСНАЙ

Па дарозе ў калгас

В. ЗУЁНАК

Узмахі шапак, поціскі рукі,
Смех, перамешаны з сігналамі машыны,
Вясёлы гурт студэнцкі гаманкі...
І вось з асфальтам зашапталі шыны.

Мінаем мінскія бульвары, карпусы
Палі--насустрач, там--лясы, імшары
І сталлю ззяюць рэчак паясы,
А вецер б'е струменямі ў твары.

Крылом поўнеба хмара абняла.
Ды, дождж калючы, перастань старацца,
Бо, як-ні-як, ўся грамада змагла
Пад плашч адзіны, як пад дах схавацца.

— Гэй, страсна, прыпеўкі запявай!—
Хтось жарт па адрасу „начальства" пасылае.

— Ого, як на вяселле Нікалай:
Гармонік, бач, у вёску дастаўляе.

— Ну што-ж тут дзіўнага? Дзень працаваць,
Настане-ж вечар.. Дык я выйду з хаты,
Гармонік расцягну, — хоць да зары спяваць,
Будзіць прасторы песняю крылатай.

Пад жарты, смех імчыцца жвава ГАЗ,
Дармо, што дзе на рытвінах і скачам ..

А неўзабаве нас сустрэў калгас,
Узмахі шапак, поціск рук гарачых.

Малацьба

Ураджайная шчодрая восень
Дзень і ноч на таку гаспадарыць.
Але сёння дружней разлілося
Рэха песні пад гул малатарні.

Бо з калгаснай дзяўчынай чарнявай
Локаць к локцю за ўвішнай работай
Стаў студэнт загарэлы, рухавы,
Твар на сонцы іскрыцца ад поту ..

Звычна, зграбна трымаючы вілы,
Хлопцы гурбы саломы кідаюць.
Вось дзе трэба і шчырасць і сіла—
Бачыш, сцірты, бы гмахі ўзрастаюць!

А дзяўчаты з запалам гарачым
Ў барабан падаюць—не шкадуюць.

„Што за хлопцы студэнты—пабачым:
Моў, управяцца ці забуксуюць?"

Толькі ў гразь мы не ўдарымся тварам:
Хіба ў нас мазалі ўжо астылі?
Ці-ж даўно мы з бацькамі, братамі
Малацілі, аралі, касілі?

І сябры налягаюць стараннa...
Не адна заглядзіцца употай,
Бо хлапцоў выбіраць вечарамі
Крыху позна—прыкмець за работай!

А тым часам, налітае сонцам,
У засек залатым вадаспадам
Зерне важкае льецца бясконца,
Нібы нашае шчасце і радасць.

Б. БУРАЎКІН

Вечарынка

Заліўчаты звонкі гармонік
Гамоніць суладна з абцасам.
Калгасная моладзь сягоння
Танцуе з студэнтамі разам.

Усмешкамі свецяцца твары
У „польцы" віхрыстай і хуткай.
Шчаслівыя кружацца пары,
Аж вецер гуляе ў закутках.

І колькі агню, весялосці
У сэрцах студэнтаў, аратых.
Ды толькі сумуе чагосьці
Танго і факстротаў аматар.

Глядзіць ён на пары скептычна,
Падбрытыя ссоўвае бровы:

—Ды гэта-ж зусім не пластычна,
Ніколькі не модна, не нова.

Ён плаўнасць цудоўнага вальса
Аддасць за крыўлянне факстрота,
За пошласць нікчэмных рамансаў—
Народнае песні пяшчоту.

З пагардной усмешкай на твары
Стаіць ён, нікім не прызнаны,
І ў танцы за параю пара
Яго абмінаюць старанна.

І добра ў клубе прасторным
Усім жартаваць і смяяцца.
З такім-жа юначым задорам,
Як гэтак нядаўна у працы.

Пачало сваю работу літаратурнае аб'яднанне, створанае пры нашай газеце. Літаратурнае аб'яднанне налічвае каля 25 маладых паэтаў і празаікаў. Яно значна папоўнілася ў гэтым годзе за лік літаратурнай моладзі, якая прышла ва універсітэт на першыя курсы. Нядаўна адбылося першае пасяджэнне, на якім былі абмеркаваны творы студэнтаў-першакурснікаў Бураўкіна, Зуёнка, Чабора, Лепесіна, Фралова і другіх.

У сённешняй літпадборцы газета змяшчае лепшыя вершы, абмеркаваныя на аб'яднанні.

С. ЛЕПЕСИН

РОДНЫЕ МЕСТА

Мне не забыть наши тихие улицы,
Снится ночами наш сад:
Там под ветрами деревья сутулятся
И шелестит листопад.

С грустью припомнится всякая всячина
И ни за что не забыть,
Будто бы с детства нам кем-то назначено
Помнить, грустить и любить.

Просто, неярко—и помнить-то нечего,
Не о чем вроде тужить.
Сколько ведь было красивого встречено,
Скольким привык дорожить!

Но не сотрут никакие видения
В памяти горстку земли
Пусть не красивую, ту, где с рождения
К сердцу навек приросли

Тропки в полях друг на друга похожие,
Ивы, что пруд стерегут,
Клёны, что улицей, будто прохожие,
Неторопливо идут.

И уезжая, мы ходим тревожные,
Словно боимся забыть
Весь этот мир в чемоданы дорожные,
С мылом своим положить.

Першыя семінары

На першых курсах філалагічнага факультэта адбыліся першыя семінарскія заняткі па асновах марксізма-ленінізма. Гэтыя заняткі паказалі, што студэнты сур'ёзна ўзяліся за вывучэнне першакрыніц. Асноўныя пытанні тэмы «К. Маркс і Ф. Энгельс. «Маніфест комуністычнай партыі» студэнты добра засвоілі. Многія з іх актыўна выступалі на семінары, самастойна выкладаючы пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі. Так, студэнтка I курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Е. Грышачкіна добра асвятліла ў сваім выступленні такое складанае пытанне, як закон абавязковай адпаведнасці вытворчых адносін характару прадукцыйных сіл. Грунтоўным было таксама выступленне студэнткі гэтага-ж курса І. Лушчыцкай. На аддзяленні беларускай мовы і літаратуры да семінарскіх заняткаў добра падрыхтаваліся студэнты А. Лазоўскі, А. Марусевіч, В. Канапліцкі.

Аднак першыя заняткі выявілі і шэраг недахопаў. Асноўны з іх—адсутнасць актыўнасці ў некаторых студэнтаў. Амаль не было на занятках творчай дыскусіі ў абмеркаванні асноўных тэарэтычных пытанняў. Студэнты не дапаўнялі і не выпраўлялі выступленняў сваіх таварышаў. Акрамя таго, студэнты слаба ўвязвалі пытанні тэорыі з жыццём. А гэта з'яўляецца галоўным пры вывучэнні твораў класікаў марксізма-ленінізма. Некаторыя студэнты не ўнікалі ў сутнасць пытання, а абмяжоўваліся запамінаннем асноўных фармуліровак.

Каб пазбегнуць гэтых памылак, неабходна пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў творча засвойваць палажэнні марксісцка-ленінскай тэорыі, а пры адказе—заўсёды падмацоўваць іх прыкладамі з нашага жыцця і з барацьбы комуністычных і рабочых партый зарубежных краін.

Творчаму засваенню марксісцка-ленінскай навукі павінны вучыцца студэнты на семінарскіх занятках.

В. СІКОРСКІ,
выкладчык, кандыдат філасофскіх навук.

ЦІКАВЫЯ ДАКЛАДЫ

Нядаўна члены гуртка фізіялогіі чалавека і жывёл заслухалі і абмеркавалі даклад аспіранта Б. Осіпава «Новыя даныя аб фізіялагічнай ролі ўнутраных органаў пачуццяў».

На чарговым пасяджэнні гуртка будуць заслуханы і абмеркаваны даклад студэнтак IV курса Н. Чаранкевіч і Л. Пурыновіч «Фізіялогія рыб возера Нарач» і даклад студэнта V курса В. Арлоўскага «Марфафізіялагічнае змяненне крыві ўпражных коней Беларусі».

В. ПАЎЛОВІЧ.

У ВОЛЬНЫ ЧАС

КРАСВОРД

(склаў студэнт аддзялення журналістыкі І. ГЛАДКІ)



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:

1. Вядомы рускі крытык. 3. Вугляроднае злучэнне. 6. Порт у Балгарыі. 8. Забарона ўвоза або вываза тавараў. 9. Газ. 10. Звярок. 11. Піонерскі лагер 13. Частка электраматора. 15. Неад'емная ўласцівасць прадмета. 17. Непрыяцель. 18. Пэўная штогадовая сума, выплачваемая страхавым таварыствам застрахованаму. 19. Нераўтварэнне. 20. Опера Дэліба. 21. Частка шкілета. 22. Старажытнагрэчаскі гісторык. 23. Хвароба. 24. Авантура. 25. Неравозка грузаў без перагрузак на прамежкавых пунктах. 28. Важнейшая састаўная частка жывога арганізма. 30. Урачысты агляд войск. 32. Спосаб. 33. Раённы цэнтр БССР. 34. Перадавік. 35. Публічная аб'ява. 36. Каменнавугальны басейн у СССР. 37. Абрыс прадмета.

ПА ВЕРТЫКАЛІ:

1. Пляцоўка, на якой дзейнічае актор. 2. Горны разбойнік. 4. Дзеяч мастацтва. 5. Чалавек, які дае сваю кроў другім. 6. Асілак. 7. Бразільскі пісьменнік. 12. Карэннае змяненне грамадскага ладу. 14. Злучэнне метала з ртуццю. 15. Злучэнне некаль-кіх машын. 16. Навуковае сачыненне. 26. Частка вулля. 27. Прадстаўнік адной з народнасцей Азіі. 28. Аэраліт у час яго палёту. 29. Паласа па краю тканіны, якая адрозніваецца ад яе колерам, узорам. 30. Невысокае пласкагор'е. 31. Рабочы на суднабудаўнічай верфі.

Рэдактар І. ХАЎРАТОВІЧ.

АТ 09275 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Тыр. 1000 Зак. 713